Яно праходзіла ў форме літаратурна-краязнаўчага марафону «Зямля родная – гонар мой» і было прысвечана знакамітым землякам. У пачатку мерапрыемства вядучыя расказалі пра помнік беларускай нацыянальнай культуры VII ст. «Баркалабаўскі летапіс». Потым быў прасочаны творчы шлях паэтаў-землякоў, чыталіся іх вершы, прайшла віктарына загадак па дзіцячай кнізе М. Пазнякова «Дзіўныя блізняты». Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава «Быхаўшчына літаратурная», на якой бібліятэкары прадставілі матэрыялы аб жыцці і творчасці землякоў.

Чарговае пасяджэнне клуба прайшло ў форме прэс-дэбюта «Часопісная імперыя», на якім былі прадстаўлены часопісы «Наука и жизнь», «Вокруг света», «Лиза», «Смена», «Мы». Бібліятэкары абанемента пазнаёмілі прысутных з часопісамі і іх рубрыкамі. Так, напрыклад, рубрыка «Мода и красота» часопіса «Лиза» была наглядна прадэманстравана некаторымі мадэлямі. Па рубрыцы «Телега жизни» часопіса «Мы» была зроблена інсцэніроўка кур'ёзнай гісторыі А.Андрэева «Ограбление по...». Увазе прысутных прапанавалі выставу «Цікавы свет часопісаў».

У форме **бібліятэчнага бартэру** прайшло пасяджэнне факультэта самаадукацыі ў Кіраўскай ЦБС, на якім вопытныя бібліятэкары падзяліліся сваімі напрацоўкамі ў прафесіі. У 2004 г. у Касцюковіцкай ЦБС быў адкрыты аддзел бібліятэчнага маркетынгу, што станоўча адбілася на метадычным забеспячэнні бібліятэчнай дзейнасці сістэмы. Супрацоўнікамі аддзела да кожнага пасяджэння рыхтаваліся прэс-дайджэсты на прафесійныя тэмы. Як удалы прыклад інавацыйнага падыходу можна назваць новы напрамак у павышэнні кваліфікацыі кадраў – распрацоўку і правядзенне **курсаў дыстанцыйнага навучання** (ДН) карыстальнікаў сеткі Інтэрнет (Магілёўская абласная бібліятэка, 2004 г.).

Вывучэнне інавацыйнага вопыту работы па павышэнню кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў рэспублікі сведчыць, што бібліятэкі выконваюць свае задачы на даволі высокім прафесійным узроўні, добра разумеюць значнасць інавацый, асабліва цяпер, калі традыцыйныя бібліятэкі ўступілі ў перыяд кардынальных пераўтварэнняў сваёй дзейнасці і робяць усё для фарміравання адпаведнага клімату ў калектывах.

У заключэнне хацелася б адзначыць, што паспяховае развіццё інавацый у многім залежыць ад індывідуальных якасцей творча працуючага прафесіянала. Аднак не менш важным з'яўляецца і стварэнне адпаведнай арганізацыйнай культуры. Неабходна зацікаўленасць кіраўнікоў бібліятэк у распрацоўцы стратэгіі і вызначэнні агульных мэтаў, падборы надзейнай каманды, здольнай стварыць атмасферу творчага спаборніцтва.

Хацелася б пажадаць бібліятэкам рэспублікі больш актыўна імкнуцца да інавацыйнай творчасці шляхам трансляцыі наяўных навацый у іншых бібліятэках, стымуляваць распрацоўкі ўласных ідэй і знаёміць грамадскасць з імі, паспяхова ўзаемадзейнічаць з іншымі ўстановамі культуры і інфармацыі, што дазволіла б нам гаварыць аб інавацыйнай дзейнасці як рухаючай сіле развіцця бібліятэк.

***А. У. Андронава,***
*галоўны бібліятэкар НДА*
*бібліятэказнаўства НББ*



***Шаноўныя супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі!***

З вялікім хваляваннем і задавальненнем віншуем Вас з наваселлем!

Многія з нас удзельнічалі на ўрачыстым адкрыцці будынка бібліятэкі, пабывалі ў чытальных залах, уразіліся сучасным тэхнічным аснашчэннем усіх памяшканняў і для чытачоў, і для супрацоўнікаў, наяўнасцю цікавых і арыгінальных рашэнняў па арганізацыі бібліятэчнай прасторы і адмысловым афармленнем інтэр'ераў.

Па ўсім гэтым відаць, што ў бібліятэцы максімальна прадумана камфортнае знаходжанне чытача любога рангу і дасведчанасці.

Мы, як адзін з атрадаў бібліятэкараў рэспублікі, адчулі гонар за Вас, дарагія калегі! Выказваем надзею, што новая Нацыянальная бібліятэка скажа сваё слова, унясе нешта важкае ў бібліятэчную справу Беларусі. Шчыра жадаем Вам поспехаў у гэтым! Плёну Вам ва ўсіх справах, моцы духу на вялікія задумы і здзяйсненні, павагі ад калег, пашаны ад улады. Хай Ваш алмаз ззяе над усёй зямлёй і Вас ведаюць бібліятэкары свету!

*Супрацоўнікі Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска і рэдакцыі часопіса*

